# ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНАГА ФАЛЬКЛОРА Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ ДЛЯ ФАГОТА

С.І.Ажыгін

"Музыку стварае народ, мы, кампазітары яе толькі аранжыруем" - М.І.Глінка.

Выкарыстанне народнага фальклора кампазітарамі-класікамі (Р.-Корсакаў - Фантазія для фагота з аркестрам, Канцэрт для фагота з аркестрам; Вэбер - Венгерская фантазія для фагота і фартэпіяна; Дубоўскі - Канцэрт для фагота з аркестрам і г.д.).

Выкарыстанне народнага фальклора ў сімфанічнай і опернай літаратуры беларускімі кампазітарамі (Чуркін М.М. - фінал сімфаньеты; Цікоцкі Я.К. - оп."Марынка"; Багатыроў А.В. - "У пушчах палесся"; Лукас - оп. "Кастусь Каліноўскі" і г.д.).

Выкарыстанне беларускага народнага фальклора ў творах для фагота. Неабходна адзначыць выкарыстанне беларускага фальклора расійскімі аўтарамі. Так прафесар Маскоўскай кансерваторыі Р.Цярохін апрацаваў для фагота беларускую народную песню "Перапелачка".

М.І.Аладаў - Санаціны № I, 2 для фагота і фартэпіяна.

П.П.Падкавыраў - Саната для фагота і фартэпіяна, на якой затрымаемся больш падрабязна. Саната складаецца з трох частак: I ч. - анданте долорозо (умерана сумна); II ч. - аллегро скерцандо (хутка з жартам); III ч. - аллегро модерато (умерана хутка). Аўтар выкарыстаў дзве беларускія народныя песні: у I-й частцы - "Ой палын мой, палыночак", у 3-й - "Ой бору мой".

Першая частка напісана ў складанай трохчастнай форме. Першая частка імправізійнага характару, як бы філасофскага роздуму аўтара, якая пераходзіць у сярэднюю частку, аснову якой складае песня "Ой палын мой, палыночак" і выконваецца троху хутчэй,чым у экспазіцыі ў танальнасці соль-мажор, потым тэма паўтараецца ў соль-дыез-міноры і фа-міноры, канчаецца частка зноў філасофскім роздумам аўтара.

Трэцяя частка пачынаецца ў ўмерана быстрым тэмпе ў характары паланэза, які пераходзіць у тэму песні "Ой бору мой" у больш спакойным тэмпе. Тэма народнай песні праходзіць на працягу ўсёй часткі тры разы і канчаецца частка урачыстым паланэзам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Санаціна № 2 для фагота і фартэпіяна М.І.Аладава складаецца з 2-х частак: андантэ і алегро. М.І.Аладаў не выкарыстоўвае народныя мелодыі, але ўвесь "дух" твора беларускі, слухая яго не скажаш, што гэта музыка расійская ці украінская, бо, наогул, уся творчасць М.І.Аладава засноўваецца на беларускім меласе.

## АНСАМБЛЕВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ

Л.К.Валасюк

Ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах у Беларусі існуе і развіваецца ў некалькіх напрамках. Гэта як прафесійныя, аматарскія, самадзейныя калектывы, так і вучэбныя ансамблі пры навучальных установах, пачынаючы з ДМШ і да вышэйшых устаноў.

У рэспубліцы створана шырокая сетка музычных школ і вучылішчаў, школ і вучылішчаў мастацтваў, музычных студый і гурткоў культурна-асветных устаноў, агульнаадукацыйных школ з музычным, эстэтычным ухілам. Ва ўсіх навучальных установах абавязкова есць прадмет "Клас ансамбля". Заняткі ў класе ансамбля пашыраюць музычныя веды вучняў, садзейнічаюць выпрацоўцы і замацаванню пачуцця рытма, музычнай памяці, прывіваюць навыкі ігры ў калектыве без дырыжора, раскрываюць багатыя магчымасці ансамблевай ігры ў пазнанні класічнай, народнай музыкі, выхоўваюць пачуцце арганічнай патрэбнасці ігры ў калектыве.

У вучэбных ансамблях у працэсе навучання найбольш выкарыстоўваюцца дуэты, трыа, як аднародныя, так і змешаныя па саставу. Гэта прызнаныя, вызначаныя формы, якія маюць свае выканаўчыя традыцыі, заснаваныя на народна-інструментальнай творчасці. Памімо традыцыйных саставаў - дуэтаў і трыа - у вучэбнай рабоце ўжываюцца квартэты, квінтэты, секстэты і змешаныя ансамблі. Узровень музычнай падрыхтоўкі выканаўцаў даволі высокі, добра валодаючы сваім асноўным інструментам, музыканты асвойваюць і іншыя і іграюць на некалькіх інструментах. Так у інстытуце культуры на кафедры народна-інструментальнай творчасці, існуюць ансам-